

## 6 КРАСАВІКА—ДЗЕНЬ ГЕОЛАГА

# АДКРЫВАЦЕЛІ СКАРБАЎ

Дзень геолага святкуе ўся краіна. У гэты дзень савецкі народ з удзячнасцю ўспамінае шматлікую армію разведчыкаў зямных нетраў. Гэта іх самаадданай працай у СССР створана самая магутная ў свеце мінеральна-сыравінная база.

Вялікі ўклад у гэтую базу ўнеслі беларускія геолагі. У нашай рэспубліцы выяўлены, разведаны і перададзены для эксплуатацыі буйныя месцанараджэнні цэментнай, керамічнай і шкляной сыравіны, мінеральных солей, нафты і іншых відаў карысных выкапняў.

Значная роля ў раскрыцці нетраў Беларусі належыць і нашаму універсітэту, на якім вядзецца падрыхтоўка геалагічных кадраў.

Выпускнікі нашага універсітэта працуюць з вялікім поспехам ва ўсіх звеннях геалагічнай службы рэспублікі. Многія з іх узначальваюць вялікія геалагічныя арганізацыі, якія займаюцца агульным геалагічным вызучэннем рэспублікі, пошукамі новых месцанараджэнняў карысных выкапняў і іх геалагічнай разведкай.

Дванаццаць выпускнікоў абаранілі кандыдацкія дысертацыі і цяпер працуюць у розных навукова-даследчых інстытутах. Некаторыя з іх з'яўляюцца супрацоўнікамі кафедры геалогіі і гідрагеалогіі і самі рыхтуюць новую партыю маладых спецыялістаў па сваёй галіне навукі.

Пасля трох год, калі ва універсітэце ўзнавілася падрыхтоўка геолагаў, на геолага-геаграфічным факультэце створана неабходная навукова-тэхнічная база, якая забяспечвае падрыхтоўку спецыялістаў на высокім узроўні. У падрыхтоўцы геалагічных кадраў прымаюць удзел высокакваліфікаваныя выкладчыкі — дактары геолага-мінералагічных навук, члены АН БССР і вопытныя дацэнты.

Універсітэт мае неабходныя базы для правядзення вучэбнай геалагічнай практыкі (БССР, Крым), дзе студэнты не толькі замацоўваюць атрыманыя веды па тэарэтычных курсах, але і набываюць патрэбныя навыкі палявых даследаванняў і авалодваюць метадамі буйнамаштабнага геалагічнага здымання.

Сёлета студэнты-гідрагеолагі выязджаюць на сваю першую вытворчую практыку ў партыі і экспедыцыі Белгеолгідратрэста, Белгіправодгаса, БелГІІЗа і Інстытута геалагічных навук. Многія з іх будуць працаваць тэхнікамі, выканаўцамі работ, бо па ўзроўню сваёй падрыхтоўкі яны здольны выконваць самастойную работу.

Пажадаем геолагам універсітэта далейшых поспехаў, а галоўнае — зрабіць першы выпуск у 1971 годзе на самым высокім узроўні.

Д. КАРУЛІН,
загадчык кафедры геалогіі і гідрагеалогіі.

НА ЗДЫМКУ: заняткі па мінералогіі са студэнтамі II курса вядзе выкладчык Р. В. Гілевіч.

Фота Г. Марозава.


ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 12 (741) ● Пятніца, 4 красавіка 1969 г. ● Цана 2 кап. Год выдання XXII


# ВЯСНОВЫ ПОДЫХ НАДЫХОДЗЯЧАЙ СЕСІІ

Універсітэцкія аўдыторыі амаль увесь дзень запоўнены. Рана сюды прыходзяць студэнты дзённага аддзялення, а затым іх змяняюць вячэрнікі. Да таго ж, калі якая-небудзь аўдыторыя застаецца свабоднай, яе займаюць тыя, каму не хапае месца ў бібліятэках, вучэбных кабінетах. І вось гэта ўжо сведчыць, што чарговая сесія на падыходзе.

Подых надыходзячай сесіі адчуваецца і на занятках. Не сакрэт, што ў гэтыя дні студэнты стараннa рыхтуюцца да семінараў, уважлівей слухаюць лекцыі.

Мы пабывалі на семінары па гісторыі КПСС у першакурснікаў гістфака. З дваццаці чатырох студэнтаў-вячэрнікаў адсутнічалі толькі двое, і высветлілася, што не прыйшлі яны па ўважлівай прычыне.

У кожнага з прысутных запісы лекцый, канспекты першакрыніц, а ў некаторых нават падрабязныя тэзісы па пытаннях з плана-семінара.

Выкладчык Іван Іванавіч Уласенка выяўляе, хто не падрыхтаваўся да заняткаў (такіх не аказалася), затым задае пытанне, ці ўсё зразумелі студэнты пры падрыхтоўцы па тэме «Партыя бальшавікоў — натхніцель і арганізатар перамогі Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі». Падымаецца дзяўчына:

— Мне не зусім зразумела, чаму лічыцца, што ў Красавіцкіх тэзісах Уладзімір Ільіч абагульніў праграму рэвалюцыйнай барацьбы, а не вызначыў яе.

Іван Іванавіч растлумачвае і робіць гэта ў форме субяседавання, у якім прымаюць удзел самі студэнты.

Першае пытанне семінара: «Абстаноўка ў краіне пасля звяржэння царызму. Выхад партыі з падполля. Утварэнне класавых палітычных арганізацый».

На гэтае пытанне адказвае Ніна Сідарэвіч. Яе выступленне лагічнае, пераканаўчае. Ніна выкарыстоўвае багаты фактычны матэрыял, з якім яна пазнаёмілася, мабыць, не толькі па вучэбных дапаможніках, але і па дадатковай літаратуры, у сучасных часопісах. Выкладчык не здзівіўся, калі не знайшлося ахвотнікаў дапоўніць гэты расказ.

— Адказ добры, асноўныя праблемы ў ім асветлены, — заўважае Іван Іванавіч.

І ўсё ж ён лічыць неабходным спыніць увагу студэнтаў на тых творах У. І. Леніна, дзе асабліва падрабязна характарызуецца абстаноўка ў нашай краіне пасля Лютаўскай рэвалюцыі.

Аб Красавіцкіх тэзісах У. І. Леніна расказаў Міша Перац. Галоўную ўвагу ён звярнуў на абгрунтаванне Уладзімірам Ільічом курса партыі на сацыялістычную рэвалюцыю.

Семінар у разгары. Кожнаму хочацца падзяліцца сваімі думкамі, уражаннямі ад прачытанага, і выкладчык такую магчымасць дае. Семінар прайшоў арганізавана і, я б сказаў, плённа. Хочацца адзначыць тую рабочую атмасферу на занятках, якая і дазваляе замацаваць пройдзены матэрыял, паглыбіць свае веды ў канкрэтных пытаннях.

Выкладчык зазначае, што наведваннем заняткаў, падрыхтоўкай да семінараў і актыўнасцю студэнтаў ён задаволен. Асабліва добра рыхтуюцца першакурснікі Панамароў, Скарабагатая, Стодараў, Сідарэвіч. Ды і іншыя, гледзячы на іх, за апошні час падцягнуліся.

Што ж, адчуваецца набліжэнне сесіі.

Ул. ШАРПІЛА.

# УПЕРШЫНЮ Ў БЕЛАРУСІ

Новае працоўнае студэнцкае лета не за гарамі. Арганізацыя будаўнічых атрадаў ва універсітэцкім штабе працоўных спраў ідзе поўным ходам. Акрамя цалінных і інтэрнацыянальных, ствараюцца атрады, для якіх працоўны семестр пройдзе ў Беларусі. На будоўлях рэспублікі будзе працаваць сёлета каля 600 студэнтаў універсітэта.

У гэтым годзе разам з традыцыйнымі будаўнічымі камплектуюцца і спецыяльныя рэстаўрацыйныя. Два такія атрады фарміруюцца на гістарычным факультэце.

Прэзідыум камітэта па ахове помнікаў культуры Беларускай ССР вызначыў два аб'екты: Сафійскі сабор у Наваполацку і Мікалаеўская царква ў Магілёве. Тут і пачнуць сваё працоўнае лета гісторыкі. Яны зробяць замеры, неабходныя для рэстаўрацыі, выканаюць шэраг будаўнічых работ.

Аб'ём работ, які намечан для эксперыментальных рэстаўрацыйных атрадаў, вельмі вялікі, і тое, што будзе зроблена ў гэтым працоўным семестры, — толькі пачатак.

## ЯКОЙ БУДЗЕ ЭМБЛЕМА?

Палітаддзел штаба Мінскага абласнога будаўнічага студэнцкага атрада прапанаваў камітэтам камсамола, штабам працоўных спраў вузаў і тэхнікумаў г. Мінска і Мінскай вобласці, камандзірам, камісарам і байцам атрадаў прыняць актыўны ўдзел у конкурсе на лепшую эмблему Мінскага абласнога атрада. Умовы конкурсу наступныя:

Эмблема павінна адлюстроўваць характар студэнцкай будоўлі, яе сутнасць. Форма эмблемы можа быць прамавугольнай (4×5 см) ці круглай (дыяметр 5 см).

Пераможца конкурсу будзе ўзнагароджан імянным падарункам.

Свае прапановы пасылайце ў штаб працоўных спраў БДУ.

ПРЭС-ГРУПА.

# ЭСТАФЕТА ФІНІШЫРАВАЛА

Рыхтуючы дастойную сустрэчу ленінскаму юбілею, прафком універсітэта правёў агляд-конкурс на лепшы студэнцкі інтэрнат.

Нядаўна на пасяджэнні бюро прафкома былі падведзены вынікі эстафеты паміж інтэрнатамі.

Жыццё і быт студэнтаў у многім залежаць ад работы студсаветаў. І таму ў час эстафеты калектыў кожнага інтэрната на старонках альбома расказваў аб сваім жыцці і адпачынку. Некалькі разоў прадстаўнікі студсаветаў, праўда, не ўсе, збіраліся і дзяліліся вопытам работы. Гэта дало магчымасць, улічваючы работу суседзяў, лепш арганізаваць і зрабіць больш змястоўным адпачынак студэнтаў. Студсаветы ж, якія не ўдзельнічалі ў абмене вопытам, як выявілася пры аглядзе, не зусім добра наладзілі работу ў сваіх інтэрнатах.

Эстафета праведзена, засталося падвесці вынікі.

— Хто выйшаў пераможцам, сказаць пакуль што цяжка, — гаворыць старшыня жыллёва-бытавой камісіі Аляксандр Лапко. — Усё вырашыцца пасля абмеркавання і аналізу работы студсаветаў на наступным пасяджэнні бюро прафкома. Але трэба адзначыць, што добра наладжана работа ў інтэрнатах № 2 і № 3 (па вул. Бабруйскай), № 1 (па вул. Свярдлова), у інтэрнаце № 6.

Сярод іншых на пасяджэнні былі абмеркаваны пытанні работы праф-бюро фізфака, дзейнасць акадэмічных камісій факультэтаў, выкананне рашэнняў парткома па кіраўніцтву работай прафкома.

А. ШАРКОЎ.

У дні вясенніх школьных канікул ва універсітэце адбылася хімічная алімпіяда. Таленавітыя хлопчыкі і дзяўчынкі з розных раёнаў Беларусі пад кіраўніцтвам супрацоўнікаў хімфака выконвалі лабараторныя работы, рашалі складаныя задачы.

На здымках нашага фотакарэспандэнта М. Нечыпарэнкі вы бачыце пераможцаў алімпіяды.







# ВАЕННА-ПАТРЫЯТЫЧНАМУ ВЫХАВАННЮ І АБАРОННА-МАСАВАЙ РАБОЦЕ — ПАЎСЯДЗЁННУЮ ЎВАГУ

> «ПАРТЫЯ ВЫХОЎВАЕ КАМУНІСТАЎ, УСІХ САВЕЦКІХ ЛЮДЗЕЙ У ДУХУ ПАСТАЯННАЙ ГАТОЎНАСЦІ ДА АБАРОНЫ САЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ АЙЧЫНЫ, ЛЮБВІ ДА СВАЁЙ АРМІІ».
>
> (З Праграмы КПСС).

**У рэпертуары універсітэцкіх самадзейных артыстаў вялікае месца займаюць творы па ваеннай тэматыцы. Са сцэны гучаць ваенныя маршы, песні аб подзвігах бацькоў і старэйшых братоў. Студэнцкі тэатр паспяхова справіўся з пастаноўкай «Маладой гвардыі» А. Фадзеева, а цяпер рыхтуе вялікі спектакль аб Зоі Касмадзям'янскай.**

**На гэтым здымку, які мы ўзялі з рэдакцыйнага фотаархіва, вы бачыце універсітэцкіх танцораў, якія выконваюць матроскі танец.**



* * *

Традыцыйнай стала дружба універсітэцкіх паэтаў і празаікаў з воінамі Савецкай Арміі. Члены Саюза пісьменнікаў БССР (іх у нас нямала) і пачынаючыя аўтары часта выступаюць са сваімі новымі творамі ў вайсковых падраздзяленнях. Воіны бываюць гасцямі і літаратурных вечароў, якія праводзяцца ва універсітэце.

**На здымку:** беларускія празаікі і пісьменнікі, у тым ліку і супрацоўнікі нашага універсітэта, у гасцях у ленінградскіх маракоў.



## ПАТРАБАВАННЕ ЧАСУ

Савецкая ўлада нарадзілася і перамагла пад сцягамі міру і прагрэсу. Першым дэкрэтам нашай краіны быў дэкрэт аб міры. Усяму свету вядомы імкненні савецкіх людзей жыць у міры і дружбе з іншымі народамі. Але ж наша краіна не абмяжоўваецца абвяшчэннем гэтых гуманных заклікаў. Яна ўжо многа зрабіла і робіць усё для таго, каб забяспечыць спакой на зямлі, каб кожны народ меў права вырашаць асабіста свой лёс, бесперашкодна будаваць сваё шчасце. Вось чаму да вялікага мірнага сцяганосца — Савецкага Саюза — прыкавана ўвага соцень мільёнаў людзей усіх кантынентаў.

Наша партыя, Савецкі ўрад зыходзяць з таго, што, пакуль захоўваецца імперыялізм, будзе заставацца небяспека агрэсіўных войнаў. Умацаванне абараназдольнасці СССР, магутнасці Савецкіх Узброеных Сіл — важнейшая функцыя сацыялістычнай дзяржавы, свяшчэнны абавязак усяго савецкага народа на сучасным этапе.

Зараз небяспека новых войнаў не знята з парадку дня. Мілітарысты ЗША і ФРГ выношваюць новыя планы ваенных авантур. У розных раёнах зямнога шара распальваюцца ачагі ваенных пажараў. Ужо шмат год працягваецца вайна ў В'етнаме, складанае становішча стварылася на Блізкім Усходзе, у Афрыцы узмацнілі свае крывавыя дзеянні англійскія каланізатары, партугальскія карныя атрады. Напружанасць міжнароднай абстаноўкі ў апошні час узмацнілася ў сувязі з правядзеннем у Заходнім Берліне федэральнага сходу па выбарах прэзідэнта ФРГ, а таксама з ваеннымі правакацыямі маоісцкай клікі на савецка-кітайскай граніцы. Імперыялісты імкнуцца паставіць на службу сваіх ваенных планаў кожны новы здабытак тэхнічнага прагрэсу, навуковыя адкрыцці.

Улічваючы ўсё гэта, мы павінны зыходзіць з таго, што небяспека новай сусветнай вайны ў сучасных умовах не толькі не паменшылася, але і рэзка ўзрасла. Пры гэтым нельга забываць, што асноўныя ваенныя прыгатаванні імперыялістаў накіраваны, перш за ўсё, супраць Савецкага Саюза. Вось чаму зараз усе партыйныя, камсамольскія і грамадскія арганізацыі павінны удзяляць асаблівую увагу, надаваць асаблівае значэнне ваенна-патрыятычнаму выхаванню і абаронна-масавай рабоце. У нас ва універсітэце ваенна-патрыятычнае выхаванне і абаронна-масавая работа сярод студэнтаў праводзяцца ў адпаведнасці з перспектыўным планам навучання і выхавання, а таксама па планах выхаваўчай работы факультэтаў і ваеннай кафедры, якія ўзгоднены з парткомам і камітэтам камсамола. Такім чынам, мы маем і перспектыўныя планы, і планы на кожны семестр, што дае магчымасць забяспечваць пераемнасць у рабоце, замацоўваць і пашыраць станоўчы вопыт, развіваць лепшыя традыцыі.

Разнастайныя формы і метады ваенна-патрыятычнага выхавання і абаронна-масавай работы. Так, ва ўсіх вучэбных групах палітычная і культурна-масавая работа накіроўваецца на выхаванне ў моладзі дзейснага патрыятызму і сацыялістычнага інтэрнацыяналізму, любві да партыі і народа, павагі да заваёў у мірным будаўніцтве і на франтах. У гутарках са студэнтамі адлюстроўваецца барацьба партыі за здзяйсненне вялікіх запаветаў У. І. Леніна па умацаванню ваеннай магутнасці нашай Радзімы, многія выступленні прысвячаюцца ролі Уладзіміра Ільіча ў стварэнні Узброеных Сіл першай у свеце сацыялістычнай краіны.

Выкладчыкі ваеннай кафедры, члены кафедр грамадскіх навук, актывісты ДТСААФ у сувязі з падрыхтоўкай да стагоддзя з дня нараджэння У. І. Леніна шырока знаёмяць студэнтаў з тэарэтычнай спадчынай Ільіча па ваенных пытаннях, растлумачваюць ленінскія прынцыпы арганізацыі абароны заваёў сацыялізма.

Асабліва папулярнымі ў нашым універсітэце сталі тэматычныя вечары, сустрэчы студэнтаў з воінамі Чырванасцяжнай Беларускай ваеннай акругі, з ветэранамі рэвалюцыі, Камуністычнай партыі, актыўнымі удзельнікамі грамадзянскай і Вялікай Айчыннай войнаў. У красавіку мінулага года ў прасторнай зале акруговага Дома афіцэраў адбыўся цікавы вечар на тэму «Запаветам Леніна верныя». Надоўга зацягнулася размова студэнтаў нашага універсітэта і політэхнічнага інстытута з камандзірамі і выдатнікамі службы многіх падраздзяленняў акругі. Газета «Во славу Родины» адзначыла, што гэтая сустрэча ўзбагаціла слаўныя традыцыі шэфскіх сувязей беларускай моладзі з арміяй. Кіраваў гэтай сустрэчай член Ваеннага Савета акругі генерал-палкоўнік В. А. Грэкаў. Тады было выказана пажаданне часцей праводзіць такія мерапрыемствы. І вось васемнаццатага красавіка студэнты зноў збяруцца ў Доме афіцэраў, дзе будзе праведзен тэматычны вечар «Вялікі Ленін на подзвігі нас натхняе».

Вялікая ўвага ва універсітэце надаецца прапагандзе сярод студэнтаў новага Закона аб усеагульнай воінскай павіннасці. У ёй актыўны ўдзел прымаюць члены таварыства «Веды», у першую чаргу ветэраны войнаў. Па прапагандзе рэвалюцыйных, баявых і працоўных традыцый савецкага народа асабліва плённымі былі два апошнія гады. У прыватнасці, вялікая работа ў гэтым напрамку праводзілася ў сувязі з падрыхтоўкай да 50-годдзя Вялікага Кастрычніка, паўвекавога юбілею Узброеных Сіл СССР, ленінскага камсамола, 50-годдзя БССР і КПБ.

Для студэнтаў рэгулярна дэманструюцца ваенна-патрыятычныя кінафільмы. Значная работа сярод выкладчыкаў, таксама з прымяненнем нагляднай агітацыі, вядзецца па лініі органаў грамадзянскай абароны.

Хацелася б адзначыць дзейснасць і такой формы выхавання, як паездкі студэнтаў у музей Брэсцкай крэпасці, сістэматычныя наведванні музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны ў Мінску, а таксама пакояў баявой славы воінскіх часцей. Традыцыйнымі ў нас сталі паходы па партызанскіх сцежках, у раёны мінулых баёў, мітынгі ля помнікаў загінуўшым воінам, партызанам і падпольшчыкам. Цяпер ва універсітэце рыхтуецца закладка помніка студэнтам і выкладчыкам БДУ, якія загінулі ў час Вялікай Айчыннай вайны.

Актыўна ўдзельнічаюць у ваенна-патрыятычнай рабоце арганізацыі ДТСААФ універсітэта. Камітэт ДТСААФ надае вялікае значэнне стралковаму гуртку, гуртку парашутнага, аўтамабільнага, матацыклетнага і радыёспорту. Камітэты ДТСААФ факультэтаў сістэматычна праводзяць у перыяд летніх канікул турысцкія паходы па месцах баявой і працоўнай славы. Так, напрыклад, у дні мінулых канікул у такіх паходах, арганізаваных разам з камітэтамі камсамола, прыняло ўдзел каля 200 студэнтаў, аспірантаў і выкладчыкаў. Прычым турысцкія групы былі не проста сузіральнікамі, слухачамі, але і самі расказвалі насельніцтву аб сваёй вучобе, выступалі з дакладамі на ваенна-патрыятычныя тэмы.

Аднак час патрабуе не задавальняцца дасягнутым. Да таго ж, у арганізацыі ваенна-патрыятычнага выхавання і абаронна-масавай работы маюцца істотныя недахопы. Я не памылюся, калі скажу, што яшчэ значная частка камсамольцаў выпадае з поля зроку і камітэтаў камсамола, і камітэтаў камсамола, і камітэтаў ДТСААФ, калі гутарка ідзе аб падрыхтоўцы значкістаў па абаронных відах спорту. Яшчэ не ўсе дэканаты, партыйныя і камсамольскія арганізацыі па-сапраўднаму ўнікаюць у работу абароннага таварыства, рэдка абмяркоўваюць яго злабадзённыя пытанні і мірацца з недахопамі. Так, 26 сакавіка на пасяджэнні партыйнага камітэта універсітэта былі заслуханы і абмеркаваны справаздачы партыйных бюро біялагічнага і хімічнага факультэтаў аб становішчы абаронна-масавай работы, ваенна-патрыятычнага выхавання студэнцтва. Партком адзначыў, што партбюро гэтых факультэтаў за апошні час аслабілі ўвагу да названых пытанняў. Тут работа па ваенна-патрыятычнаму выхаванню моладзі носіць больш эпізадычны характар. Партбюро слаба аказваюць, а, бывае, і зусім не аказваюць дапамогі ў рабоце камітэтаў ДТСААФ сваіх факультэтаў, не прынялі неабходных мер па арганізацыі і правядзенню месячніка абаронна-масавай работы (студзень — люты). Дрэнна абстаяць справы ў гэтым напрамку на філалагічным і юрыдычным факультэтах.

Да цяперашняга часу ва універсітэце не абсталяван пакой баявой і працоўнай славы, яшчэ не на належным узроўні вядзецца падрыхтоўка да 25-годдзя вызвалення Беларусі і яе сталіцы — горада Мінска ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Усе гэтыя і многія іншыя пытанні патрабуюць неадкладнага вырашэння, увагі партыйных, камсамольскіх і прафсаюзных арганізацый, усёй нашай грамадскасці. Можна быць упэўненым, што з іх дапамогай значна палепшаць сваю работу пярвічныя факультэцкія арганізацыі ДТСААФ. Але ў заключэнне мне хацелася б спыніцца яшчэ на адным пытанні.

У сённяшнім нумары газеты «Беларускі універсітэт» друкуецца пісьмо выпускніцы журфака. Яно павінна прыцягнуць увагу усяго універсітэцкага калектыву. Сапраўды, у нас ёсць усе магчымасці абучыць не толькі хлопцаў, але і дзяўчат-студэнтак валоданню лёгкай стралковай зброяй. Ды і гутарка павінна весціся не аб магчымасцях, а аб найпершым абавязку — да абароны Радзімы павінен быць падрыхтаван кожны. Думаецца, што камітэты ДТСААФ факультэтаў улічаць просьбу студэнтак, пашыраць існуючыя і створаць новыя стралковыя гурткі. Справа прадстаіць вялікая, і за яе трэба брацца неадкладна, як неадкладна неабходна вырашаць і іншыя пытанні. Паўтараю, гэтага патрабуе час.

І. МАЗЖУХІН,
загадчык ваеннай кафедры.

## ТАК ДУМАЮЦЬ ДЗЯЎЧАТЫ

У дні ваенных правакацый маоісцкай клікі на савецка-кітайскай граніцы многа пісалася аб баявых подзвігах савецкіх пагранічнікаў, людзей старэйшага і малодшага пакаленняў. Гаварылася таксама і аб жанчынах. Усім, мабыць, запомніліся газетныя радкі, у якіх расказвалася аб тым, што жонкі афіцэраў былі першымі, хто прыйшоў на дапамогу параненым героям, — яны выконвалі абавязкі ўрачоў, медыцынскіх сясцёр.

А што б рабіла я, апынуўшыся ў такім становішчы? Не спяшайцеся з вывадамі, я не выпадкова стаўлю гэтае пытанне, да таго ж, мае думкі раздзяляюць многія дзяўчаты — выпускніцы універсітэта. Ва універсітэце мы атрымліваем глыбокія веды па тэарэтычных дысцыплінах, набываем пэўныя практычныя навыкі, наогул атрымліваем высокую кваліфікацыю па спецыяльнасці. Вядома, набываем мірную спецыяльнасць. Гэта, зразумела, правільна. І ўсё ж хацелася б сказаць, што ў цяперашні час у мэтах умацавання абароны краіны кожнаму неабходна і ваенная спецыяльнасць, у першую чаргу — маладым людзям. Мы з удзячнасцю будзем успамінаць універсітэт і за тое, што тут прайшлі падрыхтоўку па праграме курса медыцынскіх сясцёр. Але ж вядома, што вельмі часта на фронце медыцынскія работнікі са зброяй у руках змагаліся супраць ворага. На жаль, ва універсітэце мы не вывучалі зброю, не навучыліся страляць, хоць такая магчымасць была. Я маю на ўвазе гурткі ДТСААФ. У іх саставе вельмі мала дзяўчат. А ці правільна гэта? Здаецца, кіраўнікам і актывістам абароннага таварыства неабходна падумаць аб тым, што ва універсітэце палова студэнтаў — дзяўчаты, а на некаторых факультэтах — іх большасць.

Ва універсітэце працуе нямала жанчын — удзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны. За баявыя подзвігі на франтах, у партызанскіх атрадах, у падпольных арганізацыях яны ўзнагароджаны ордэнамі і медалямі Савецкага Саюза, аб некаторых напісаны кнігі. Многія з гэтых жанчын, да вайны — маладых дзяўчат, актыўна удзельнічалі ў абаронна-масавай рабоце, былі варашылаўскімі стралкамі, і, безумоўна, набыты вопыт у час вайны вельмі спатрэбіўся ім. Іх прыклад для нас вельмі павучальны.

Нам, выпускніцам, ужо позна думаць аб удзеле ў абаронных гуртках, мабыць, мы і самі крыху вінаваты. Мы звяртаемся да студэнтак малодшых курсаў не паўтарыць нашу памылку. І, разам з тым, хочацца звярнуцца да кіраўнікоў ДТСААФ універсітэта, да партыйных і камсамольскіх актывістаў факультэтаў з просьбай больш увагі ўдзяляць у абаронна-масавай рабоце дзяўчатам.

Л. ШАБАН,
студэнтка IV курса журфака.

# ПУЦЯВОДНАЯ ЗОРКА




Нядаўна ў «Звяздзе» былі надрукаваны ўспаміны Я. Г. Ракава аб тых незабыўных днях, калі ён слухаў Уладзіміра Ільіча Леніна. Якаў Гдальевіч Ракаў — прафесар кафедры палітычнай эканоміі Беларускага політэхнічнага інстытута, выхаванец нашага універсітэта. Да паступлення ў БДУ ён прайшоў вялікі шлях па франтавых дарогах грамадзянскай вайны. Член партыі з 1917 года, Я. Г. Ракаў у складзе часцей Чырвонай гвардыі прымаў удзел у баях пад Псковам, быў ваенным камісарам батальёна, затым ваенкомам палка, брыгады, баявога ўчастка, начальнікам ваенна-палітычных курсаў, з'яўляўся дэпутатам Петраградскага Савета рабочых і салдацкіх дэпутатаў.

Ніжэй змяшчаюцца яго ўспаміны.

**У канцы ліпеня 1918 года мяне тэрмінова выклікалі на пасяджэнне камуністычнай фракцыі Петраградскага Савета. Тут жа прысутнічала дэлегацыя ЦК РКП(б) на чале з таварышам Я. М. Свярдловым. Было вырашана пятую частку фракцыі мабілізаваць на фронт.**

**Зборы былі нядоўгія. Назаўтра ў другой палавіне дня эшалон з мабілізаванымі камуністамі паехаў у Маскву, дзе нам уручылі накіраванне на фронт. З намі ехаў і Я. М. Свярдлоў, які здзіўляў усіх сваёй прастатой, таварыскасцю. Свярдлоў пайшоў з намі ў Крэмль, дзе ў вялікай зале адбылася сустрэча з У. І. Леніным.**

**Як вядома, Ленін у такіх выпадках прыходзіў загадзя, каб пагутарыць з людзьмі да пачатку пасяджэння ці нарады. На гэты раз ён таксама апярэдзіў нас. Але, супраць звычайнага, не размаўляў з намі асобна. Бледнаваты і стомлены, ён сядзеў за сталом, падпіраючы рукамі галаву. Мы гэта адразу заўважылі і, быццам згаварыўшыся, не падыходзілі да яго, не задавалі пытанняў.**

**Праз мінут пятнаццаць-дваццаць, калі ўсе сабраліся, слова ўзяў Ленін. Куды дзелася стомленасць. Ён гаварыў зразумела, проста, лагічна і пераканаўча. Кожны раз, калі мне даводзілася слухаць выступленне У. І. Леніна, я здзіўляўся, што Ільіч гаварыў іменна тое, што мне хацелася пачуць. Пазней я зразумеў, што тут няма ні выпадковасці, ні містыкі. Проста Уладзімір Ільіч трымаў руку на пульсе грамадства, ведаў, хто чым цікавіцца, што хвалюе, і адпаведна будаваў сваё выступленне.**

**Так было і ў канцы ліпеня 1918 года. Мы ў якасці палітработнікаў ехалі на фронт і хацелі ведаць, якія нашы абавязкі і правы, якое агульнае становішча краіны, як наладжваць узаемаадносіны з насельніцтвам вызваляемых раёнаў. Нарэшце, хацелася пачуць цёплае слова Леніна. Уладзімір Ільіч расказаў аб міжнародным і унутраным становішчы Савецкай Расіі, гаварыў аб ролі і дзейнасці ваенных камісараў. Вы, пытаў ён, чые камісары? Партыі вы камісары, прадстаўнікі Камуністычнай партыі, яе упаўнаважаныя.**

**Уладзімір Ільіч гаварыў аб неабходнасці стварэння на вызваляемых тэрыторыях камітэтаў беднаты, аб мэтазгоднасці ўключэння ў іх састаў былых франтавікоў.**

**Запомнілася характарыстыка кулацтва. Нам, гаварыў Ільіч, не столькі небяспечны каледзіны і дутавы, колькі небяспечны кулакі; іх шмат, яны звязаны з вялікай колькасцю сераднякоў, у іх надзвычай развіта пачуццё уласніцтва, яны жорсткія і ў барацьбе за сваю уласнасць ідуць на самыя страшэнныя зверствы. Калі мы не пераможам кулакоў, не адарвём ад іх асноўныя масы сялянства, мы не ўтрымаем Савецкую ўладу.**

**Ленін сказаў нам некалькі слоў аб нашых паводзінах у быце. Партыя наша, гаварыў ён, заваявала ў масах аўтарытэт. Мы скінулі ўладу эксплуататараў, мы далі сялянам зямлю, мы пакончылі з праклятай імперыялістычнай вайной, будуем новае жыццё. Аўтарытэт партыі вялікі. Гэты аўтарытэт залежыць не толькі ад палітыкі і рашэнняў партыйных органаў, але і ад вас. Вы жывяце сярод насельніцтва, вы ў іх на вачах, вы прадстаўляеце кіруючую партыю. Усякая нядобрасумленнасць у быце: атрыманне больш, чым патрэбна, матэрыяльных даброт, п'янства, разбэшчаны спосаб жыцця прыніжаюць аўтарытэт не толькі асабіста ваш, але і партыі, бо простыя людзі думаюць і гавораць: што гэта за партыя, якая церпіць у сваіх радах такіх прайдзісветаў!**

**Калі Ленін гаварыў аб цяжкім становішчы нашай краіны, у яго словах не было ні кроплі песімізму. Ён дэталёва спыняўся на цяжкасцях не для таго, каб у адчаі апусціць рукі, а для таго, каб знайсці шляхі пераадолення гэтых цяжкасцей. Праслухаўшы парады Леніна, мы былі акрылёны і рваліся ў бой, не сумняваліся ў канчатковай перамозе.**

**Яшчэ хачу расказаць, як летам 1919 года я быў ваенным камісарам баявога ўчастка, часці якога стрымлівалі напор белапалякаў на захад ад Мінска. Становішча наша было вельмі цяжкае, мы адступалі пад націскам пераважаючых сіл праціўніка. На поўдні Расіі нашы часці таксама адступалі пад напорам дзянікінскіх войск. Але вось да нас прыбыў таварыш Юліян Мархлеўскі. Ён мне сказаў, што Уладзімір Ільіч аптымістычна ацэньвае наша становішча. Перамогі на Усходнім фронце хутка дадуць нам магчымасць узмацніць войскі на Заходнім. Я неадкладна аб'ехаў усе часці і паведаміў камуністам і камсамольцам думку Леніна аб становішчы краіны, і гэта дало вялікі эфект.**

**Словы Леніна былі для нас пуцяводнай зоркай.**

**Я. РАКАЎ, прафесар.**

# ЗНАМЯНАЛЬНЫ ГОД

Амаль усе аспіранты нашага універсітэта з'яўляюцца прапагандыстамі. Мы сустрэліся з адным з іх, аспірантам кафедры навуковага камунізма Георгіем Пашкоўскім, і ўзялі ў яго інтэрв'ю.

Першае наша пытанне было аб сакрэтах прапагандысцкай работы.

— Сакрэт таленавітага прапагандыста? — усміхнуўся Георгій. — Што-небудзь катэгарычна сцярджаць у гэтых адносінах, бадай, немагчыма. Па-мойму, галоўнае — зацікаўленасць слухачоў. Шчыра кажучы, гэта не заўсёды лёгка. Але калі гэта ўдаецца зрабіць — лічы, што дзень прайшоў паспяхова.

— Скажыце, чым знамянальны гэты год для сеткі палітычнай асветы?

— Калі гаварыць аб цяперашнім перадюбілейным годзе, то галоўная задача прапагандыста — папулярызацыя ленінскай спадчыны.

— Георгій, прапагандысту, як вядома, на многія пытанні даводзіцца адказваць экспромтам. Як вы спраўляецеся з гэтым?

— Гэта непазбежна. Умелае асвятленне такога роду пытанняў, відаць, — яшчэ адзін сакрэт добрага прапагандыста. Мне, напрыклад, у апошні час даводзіцца ў такім плане шмат гаварыць аб міжнароднай палітыцы.

— Існуюць разнастайныя формы прапагандысцкай работы. Якой вы аддаяце перавагу?

— Бачыце, тут кожная па-свойму добрая. Трэба проста глядзець на абставіны, якая перад табой аўдыторыя. Пры вызначэнні форм даводзіцца шмат канкрэтызаваць. Напэўна, гэта правільны шлях.

— І апошняе пытанне, Георгій, Гавораць, людзям падабаецца рабіць тое, што яны ўмеюць. Вам падабаецца работа прапагандыста?

— Гэта вельмі патрэбная справа. Па-мойму, гэта вельмі важна для нас, будучых выкладчыкаў вышэйшых навучальных установ.

Я пажадала Георгію поспехаў, і мы развіталіся.

Д. КЛАРАВА.



Гэты здымак зроблен на Беларускай студыі радыёвяшчанння.

Адзін з найбольш вопытных работнікаў рэспубліканскага радыё І. А. Шыбуня знаёміць студэнтаў факультэта журналістыкі з радыёапаратурай.

Фота А. Ласмінскага.

АГЛЯД ДРУКУ

# ПЕРАД АПОШНІМ ТУРАМ

**У сувязі з падрыхтоўкай да 150-годдзя з дня нараджэння К. Маркса і 50-годдзя БССР і Кампартыі Беларусі партком універсітэта аб'явіў агляд-конкурс насценных газет. Вынікі першага тура былі падведзены да 5 мая 1968 года. У спаборніцтве газеты занялі адпаведныя месцы. Застаўся толькі месяц, калі будуць падводзіцца і вынікі другога тура. Нельга сказаць, што рэдкалегіі не адчуваюць набліжэння гэтага часу, але варта прайсціся па калідорах і зірнуць на стэнды, дзе звычайна вісяць факультэцкія газеты,—і ўражанне адразу ж мяняецца. Работу органаў друку схаваць нельга — яна на віду ў кожнага.**

**Хіба можа скласціся станоўчае ўражанне, калі «Хімік», «Савецкі юрыст» і «Слова філолага» да гэтага часу ўсё яшчэ віншуюць жанчын з днём 8 Сакавіка, і на іх старонках усё яшчэ чуюцца водгукі зімовай сесіі.**

**Ідзе падрыхтоўка да 100-годдзя з дня нараджэння У. І. Леніна. Адпаведна з пастановай парткома, «сценгазеты павінны паляпшаць асвятленне падрыхтоўкі універсітэта да ленінскага юбілею, кваліфікавана паказваць выкананне факультэтамі, групамі сацыялістычных абавязацельстваў». Але, на жаль, нельга сказаць, што гэтая пастанова выконваецца паспяхова. Ніякага паляпшэння пакуль што не відаць.**

**Даволі рэдка паяўляюцца на сценах і курсавыя газеты. А калі і паяўляюцца, дык толькі для таго, каб «павесяліць публіку». Гэтай жа «мэце» адводзяць значнае месца і факультэцкія газеты. Ніхто не аспрэчвае неабходнасць паяўлення гумарыстычных матэрыялаў да першага красавіка (да дня смеху), але ж, акрамя пустога смеху, у іх павінна прысутнічаць і сатыра.**

**Правільна гаворыцца ў спецвыпуску фізічнага факультэта: «Смех — справа сур'ёзная». Хіба няма ў нас каго высмеяць, пакрытыкаваць! І калі ўлічыць яшчэ, што нашы баявыя «Камсамольскія пражэктары» не часта «свецяцца» на стэндах факультэтаў. Апошняе ў асаблівай меры адносіцца да філалагічнага, гістарычнага і юрыдычнага факультэтаў. Выпуск «КП» — тут вялікая падзея.**

**Жаўцеюць ад часу на многіх факультэтах і органы СНТ. Бюлетэні студэнцкіх навуковых таварыстваў, на жаль, выходзяць усё яшчэ рэдка. Чаму б не ўзяць прыклад, скажам, з фізічнага факультэта, дзе на старонках выпускаў СНТ змяшчаецца многа цікавых матэрыялаў.**

**Заўсёды прыемна зайсці на біялагічны факультэт. Тут ёсць што пачытаць.**

**Газета «Віта» па-ранейшаму трымае марку лепшай газеты універсітэта. На яе старонках вы знойдзеце самыя разнастайныя матэрыялы: аб вучобе і дысцыпліне, адпачынку і навуковых адкрыццях, спартыўных навінах і мастацкай самадзейнасці. Асаблівай увагі заслугоўваюць і матэрыялы, прысвечаныя ленінскаму юбілею.**

**Нельга прайсці на факультэце і міма аб'ёмістага выпуску СНТ, дзе змяшчаюцца цікавыя расказы аб маладых вучоных, даследчыках-студэнтах, аб праблемах кафедр і гурткоў.**

**Як бачым, павучыцца ёсць у каго. Гэты станоўчы прыклад варта пераняць.**



# МЕНДЗЯЛЕЕВУ ПРЫСВЯЧАЕЦЦА

*Вялікі рускі вучоны Дзмітрый Іванавіч Мендзялееў (1834—1907 гг.) адкрыў і абгрунтаваў перыядычны закон хімічных элементаў, які з'яўляецца прыродазнаўча-навуковай асновай сучаснага вучэння аб рэчыве.*

*Нядаўна грамадскасць універсітэта ўрачыста адзначыла 100-годдзе гэтай выдатнай навуковай падзеі. На хімічным факультэце адбылося спецыяльнае пасяджэнне вучонага савета, на якім прысутнічалі вядомыя вучоныя, супрацоўнікі і госці універсітэта.*

*НА ЗДЫМКУ: урачыстае пасяджэнне адкрывае дэкан хімічнага факультэта Ф. М. Капуцкі.*

*Фота М. НЕЧЫПАРЭНКІ.*

